# Міжнародны дзень роднай мовы: годна і маштабна

## *У краіне адзначылі Міжнародны дзень роднай мовы. З нябачаным да гэтага размахам*



Міністр культуры Павел Латушка таксама прысутнічаў на свяце ў БДУКМ.



Падчас святкавання Міжнароднага дня роднай мовы ў Белдзяржуніверсітэце культуры і мастацтваў.

Асабліва пашчыравалі ў святкаванні літаратурныя музеі і ўніверсітэты. Так, якраз у гэты дзень, 21 лютага, у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адкрыўся першы этап грамадска-культурнай акцыі "Чытаем Купалу разам". Нацыянальнага прарока цытавалі міністр культуры Павел Латушка, старшыня Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны, старшыня Саюза тэатральных дзеячаў Аляксей Дудараў, кіраўнік Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Аляксандр Яфрэмаў, старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі і многія іншыя.

У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным доме-музеі Якуба Коласа цытавалі, натуральна, другога нашага класіка, але з той жа ўлюбёнасцю ў моўную беларускую стыхію. Спецыяльна да свята коласаўцы падрыхтавалі выставу "Якуб Колас і Нацыянальная акадэмія навук Беларусі: да вытокаў беларускай навукі аб слове".

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў зладзіў з нагоды Міжнароднага дня роднай мовы цэлы фэст — з конкурсамі на лепшае выкананне песень і танцаў, вiктарынамі і батлейкай, кірмашом нацыянальных беларускіх строяў. Сваімі паэтычнымі далікатэсамі студэнтаў частавала вядомая паэтка Раіса Баравікова.

А ў Беларускім дзяржаўным універсітэце сумяшчалі забаўляльныя і навуковыя мерапрыемствы. У прыватнасці, выкладчыкі філфака правялі цыкл лекцый на тэму "Беларуская мова як неацэнны скарб народа" на 12 факультэтах БДУ. На самім філалагічным факультэце свята віталі прыгожай літаратурна-музычнай кампазіцыяй "Табе складаю шчыры свой санет, прапрадзедаў маіх жывая мова...", падчас якой прагучалі вершы на мовах тых краін, чые прадстаўнікі вучацца на філфаку. У Інстытуце журналістыкі прайшоў цэлы шэраг адметных акцый, такіх як флэш-моб "Беларуская мова передаецца праз абдымкі", майстар-клас "Як пачаць размаўляць па-беларуску штодня", дэбаты на тэму "5 гадоў навучання на факультэце журналістыкі — ці не зашмат?" і святочны канцэрт.

Між іншым святочныя дзеі ў БДУ працягваюцца. Сёння ў Інстытуце журналістыкі адбудзецца III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Жыццём і словам прысягаючы...", прысвечаная 90-годдзю доктара філалагічных навук прафесара Міхаіла Цікоцкага, а на філфаку — сустрэча з галоўным супрацоўнікам аддзела славістыкі і тэорыі мовы НАН Беларусі, акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук Еўропы, прафесарам Генадзем Цыхуном.

Заўтра ў Інстытуце журналістыкі будзе ў цэнтры ўвагі адмысловая алімпіяда-гульня "Мова родная — мова модная". Філфакаўцы ж абазначылі заўтрашні дзень як Дзень беларускага перакладу ў кантэксце праблемы перакладу Святога Евангелля на беларускую мову. З выкладчыкамі і студэнтамі сустрэнецца старшыня камісіі па перакладзе літургічных тэкстаў і рэлігійнай літаратуры, кандыдат гістарычных навук, магістр тэалогіі, перакладчык Уладзіслаў Завальнюк.

**Падрыхтаваў Міхал КАСЦЮЧЫК.**
**Фота БелТА.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ